*УДК 398.332.33(476.2-37Ветка)*

**А. А. Нарук**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# МЯСЦОВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЖНІЎНАЙ АБРАДНАСЦІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА)

*У артыкуле на аснове багатага фактычнага матэрыялу, запісанага ў палявых экспедыцыях выкладчыкамі і студэнтамі ГДУ імя Францыска Скарыны на тэрыторыі Веткаўскага раёна, разглядаюцца лакальныя асаблівасці жніўнай абраднасці. Прааналізаваны мясцовыя асаблівасці такіх відаў жніўнай абраднасці, як зажынкі і дажынкі, засяроджана ўвага на звязаных з імі прыкметах і павер'ях.*

Яшчэ са старажытных часоў хлеб у жыцці беларусаў меў сакральны статус. Гэты культ абумовіў наяўнасць у нацыянальным светапоглядзе веры ў шматлікіх духаў, што апекаваліся нівай, а таесама разнастайных рытуалаў, звязаных з аграрнай магіяй. Невыпадкова жніво з'яўляецца важным элементам земляробчага календара: яно падводзіла вынік штодзённай упартай працы. Па яго выніках можна было меркаваць пра дабрабыт асобнай сям'і, добры ўраджай – зарука лёгкай зімоўкі, выратаванне ад галоднай смерці. Таму жніво суправаджалася багатым комплексам поліфункцыянальных рытуалаў і звычаяў. У кожным з рэгіёнаў Беларусі ён меў адметны характар.

Структура жніўнай абраднасці на Гомельшчыне, як і паўсюль на Беларусі, уяўляе сабой тры паслядоўныя этапы: зажынкі, уласна жніво і дажынкі. "Паняцце "зажынкі" (зажон) уключае два тлумачэнні: першае (сітуацыйнае) – зажынкі як пачатак жніва, другое (функцыянальнае) – зажынкі як абрад" [1, с. 328]. Такім чынам, сітуацыйны і функцыянальны пачаткі накладаліся, утвараючы арганічны сінтэз, які і вытлумачваў, на першы погляд, звычайную, побытавую падзею як сакральны абрад, надаваў яму цэласнае рытуальна-магічнае афармленне.

Звычайна зажынкі былі прымеркаваны да рэлігійнага свята – дня ўшанавання апосталаў Пятра і Паўла. І ў самім абрадзе, нягледзячы на яго паганскія карані, прасочваюцца відавочныя элементы хрысціянскай традыцыі: *"Штобы быў добры ўраджай, хадзілі асвячаць поле – не ўсе, праўда, сначала хаця б. Мая бабуля ўсегда сама эта дзелала. Возьме бутэлечку з вадою і пайшла па лугу, а пад нос прыгаворвае што-та"* (в. Старое Сяло) [2, с. 217]. Непарыўнае спалучэнне язычніцкіх і

хрысціянскіх уяўленняў і рытуалаў – адметная рыса беларускай нацынальнай ментальнасці і народнай духоўнай культуры.

Асаблівая ўвага надавалася зажынальніцы, якая павінна была адпавядаць шэрагу патрабаванняў, каб забяспечыць поспех усёй грамадзе. Пры яе выбары ўлічвалі здароўе жанчыны, яе працавітасць, здольнасць паспяхова весці гаспадарку, а таксама звярталі ўвагу і на маральныя якасці. Важным быў і знешні выгляд жняі: нельга было ісці зажынаць у штодзённай ці бруднай вопратцы, чыстае святочнае ўбранне было абавязковым: *“Выбіралі путнейшую жанчыну, каб была здаровая. У суботу вытапяць баню. Перад Пятром. Казалі: “Заўтра ж Пятро, дак трэба зажаці жыта”. Пасля бані жанчына перадзявалася ў чыстае адзенне. Потым гэтая жанчына ішла на поле і зажынала 5–10 снапоў”* (в. Акшынка) [2, с. 206].

У лакальных традыцыях Гомельшчыны сустракаецца звычай аглядаць поле перад жнівом на наяўнасць заломаў (“завіткаў”, “завязкаў”, “завязяў”). Звычайна іх рабілі вядзьмаркі з мэтай нашкодзіць асобнай сям’і ці вёсцы ў цэлым: маглі наклікаць хваробы на людзей, паморак на жывёлу, патравы на ніву і г. д.: *“Када я зашла замуж, я ў сьвякроўкі жала жыта первы год. Я зажала, я бачыла, што там памята, я думала, мо куры патаптаті ці што, а эта залом быў. А патом вечарам свякроўка сама пашла жаць, а залом гэты ўвідзела:“Во, добра, дзетка, што ты яго ня сжала. Эта хто-та плахі чалавек залом сьдзелаў”. Як сажнеш – забалеяш”* (в. Чырвоны Кут) [1, с. 329].

Першаму зжатаму снапу надавалася вялікае сакральна-магічнае значэнне. Яго звычайна ставілі ў чырвоным куце пад абразамі, захоўвалі год (да наступнага жніва) і выкарыстоўвалі ў іншых рытуалах земляробчага календара: асвянчонае зерне выкарыстоўвалі для сяўбы, а сам сноп быў неабходным атрыбутам каляднай вячэры (яго ставілі на святочны стол, па ім варажылі на будучы ўраджай). Часам першым нажатым каласам надавалі сімвалічную форму кола шляхам спляцення іх у вянок: *“На зажон рабілі вянок з калосься і захоўвалі яго на іконе цэлы год”* (в. Стаўбун) [1, с. 333].

Пасля зажынак пачыналася жніво – самы складаны і знясільваючы этап. Да працы далучаліся і маладыя дзяўчыты, і сталыя кабеты, нават дзеці і падлеткі. Асабліва цяжка было цяжарным і маладзіцам з немаўляткамі. Ім даводзілася браць малых з сабой на поле, на якім непадалёку ад матчынай паласы, майстравалася калыска і невялікі будан, што ахоўваў дзіця ад сонца і спёкі.

Працавалі з ранку да вечара. І ў такіх умовах песня была дзейсным сродкам паляпшэння фізічнага і псіхалагічнага стану жней, яна з’яўлялася неад’емным элементам жніўнай абраднасці: *“Жнуць,*

*падабабкі вяжуць – пяюць, усё сь песьнямі. То пра жніво пяюць, то пра жызьць якую, і ўсе хорам”* (в. Чырвоны Кут) [1, с. 336]. Паводле меркаванняў А. Ліса, “жніўная паэзія ўвабрала ў сябе і таленавіта ўвасобіла (сродкамі міфалагічнай і рэалістычнай паэтыкі) атмасферу жніва, характар цяжкай, пад спякотлівым сонцам адказнай работы” [3, с. 3].

Вялікая колькасць жніўных песень прысвечана тэме кахання:

*Закацісь, закацісь ты, жаркае сонца,*
*А за лес, за лясок.*
*Ты прыбудзь-ка, прыбудзь,*
*Дружочак мой любезны,*
*Прыбудзь-ка на часок…*

(в. Акшынка) [2, с. 206].

Часта ў жніўных песнях гучаць матывы шлюбу, сямейнага жыцця, часам нешчаслівага:

*Ой, нашто ж ты мяне, мая мамка родна,*
*На горечка радзіла?*
*Ой, нашто ж ты мяне, мая родная,*
*Горьку долю ўдзяліла?*
*Удзяліла ж ты мне горькую долечку:*
*За п’яніцу аддала,*
*За п’яніцу, за няўдаліцу,*
*За горькую сірату…*

(в. Янова) [2, с. 212].

Скінуць стому і аднавіць сілы жнеям дапамагалі і традыцыйныя гульні. Напрыклад, частка ўдзельніц згіналася, астатнія ж прыгалі праз іх; бегалі адна за адной у даганялкі. Таксама быў звычай качацца па полі: дзве жанчыны кладіся на зямлю і, абдымаючыся, перакочваліся са спіны адной на спіну другой, і так некалькі разоў. Лічылася, што гэта дзеянне дапамагала пазбавіцца ад болю ў паясніцы і касцях.

Па заканчэнні жніва наступалі дажынкі. Гэты этап вылучаецца адметным старажытным абрадам, характэрным для ўсіх усходніх і паўднёвых славян, які называлі “барадой”, “дажынкамі” ці “чубком”: *“Дажынаюць жыта, паследняе ўжо. Выбіраюць двенаццаць каласоў, глядзяць, штоб жыта роўненькае было, каласы дзябёлыя. Каласы звязваюць разам. Тады ўбіраюць іх цвітамі, кітайкамі з нізу да верху. Расчышчаюць зямлю ету, куды каласы ставюць, ржэўнік увесь адкідваюць, капаюць ямачку, кладуць у тую ямачку хлеб, соль і ваду. Кажуць:*

*– Вот табе, барада, хлеб, соль і вада”* (в. Данілавічы) [2, 209].

Згодна з народнымі ўяўленнямі, гэты рытуал спрыяў плоднасці нівы. Верылі, што нібыта пасля яго правядзення ўвесь ураджай у наступным годзе будзе падобным па якасці тым каласам, што былі сабраны ў апошні сноп.

На Гомельшчыне найбольш распасюджанай была наступная форма "барады": звязаныя ўверсе каласы (замацоўвалі пераважна чырвонай ніткай), упрыгожвалі кветкамі, што сімвалізавалі красаванне, квітненне прыроды. Сам абрад быў скіраваны на захаванне, "завязванне" жыццёвых сіл, ураджайнасці нівы на наступны год.

Таксама быў шырока распаўсюджаны звычай рабіць дажынкавы вянок, які пралі з каласоў, упрыгожвалі стужкамі, палявымі кветкамі, галінкамі з ягадамі каліны ці рабіны, і меў ён пераважна круглую форму. Такі вянок захоўвалі на покуці разам з зажынкавым снапом і верылі, што зерне з яго павінна было забяспечыць будучы багаты ўраджай.

Святкаванне дажынак суправаджалася ўрачыстымі гуляннямі і сумеснымі застоллямі. Лічылася, што быццам шчодра накрыты стол абяцаў добры ўраджай у наступным годзе: *"Пасля дажынак мы ўжо так пачыналі гуляці, што завідавалі ўсе суседзі. Тожа сабіраліся на полі. Не, кастры не палілі. Увакруг пажатага жыта і начыналі хараводы вадзіць, песні пеці, гульні розныя іграці"* (в. Старое Сяло) [2, с. 218].

Самі гулянні суправаджаліся адметнымі дажынкавымі песнямі:

*А ў нас сёння дажыначкі,*
*Мы жыцечка дажалі.*
*Мы жыцечка дажалі,*
*Бародачку завязалі.*
*Бародачку завязалі,*
*Хлеба-солі паклалі…*

(в. Янова) [2, с. 212].

Такім чынам, жніўныя абрады і песні Веткаўскага раёна адначасова захоўваюць іх агульнанацыянальную аснову і выяўляюць адметныя лакальныя рысы ў рытуалах, песнях, прык метах і павер'ях.

**Спіс літаратуры**

1 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 910 с.

2 Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / Аўт. уклад.: І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – 362 с.

3 Ліс, А. С. Жніўныя песні: манаграфія / А. С. Ліс. – Мінск : “Навука і тэхніка”, 1993. – 208 с.